# СВЯТА ПАМЯЦІ

Ларыса Таірава

**Нататкі з рэспубліканскага фестывалю народнаінструментальнага выканальніцтва, прысвечанага Г. Жыхараву**



Георгій Жыхараў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Артыкул першы**

Амаль 23 гады мінула з таго часу, калі не стала сярод нас Георгія Іванавіча Жыхарава — выдатнага музыканта-асветніка, педагога, дырыжора, яскравага выканаўцы на балалайцы і домры, чыя дзейнасць аказала велізарны ўплыў на развіццё народнаінструментальнага жанру ў Беларусі. 20 год — гэта вельмі кароткі тэрмін для гісторыі, але яго хапіла, каб у поўнай меры асэнсаваць маштаб і значнасць дзейнасці гэтага унікальнага чалавека.

Сёлета спаўняецца 80 год з дня нараджэння Г. Жыхарава. У сувязі з гэтым Асацыяцыя беларускіх дамрыстаў і мандаліністаў на чале з яе прэзідэнтам заслужанай артысткай РБ, прафесарам Г. Асмалоўскай (якая, дарэчы, з'яўляецца яго вучаніцай) выступіла з ініцыятывай правядзення рэспубліканскага фестывалю памяці Г. Жыхарава. Гэта ідэя знайшла падтрымку не толькі ў Міністэрстве культуры і друку, Беларускай акадэміі музыкі, Саюзе музычных дзеячаў, Белдзяржфілармоніі, але і зварухнула ўсё музычнае асяроддзе. Па ўсёй рэспубліцы прайшлі тэматычныя канцэрты, сустрэчы-пасяджэнні, мясцовыя фестывалі памяці Г. Жыхарава.

Толькі ў Мінску ў межах фестывалю, які адбыўся 14—19 лістапада 1995 года, было дадзена 7 канцэртаў, у якіх прымалі ўдзел 9 аркестраў, 30 ансамбляў, 27 салістаў — усяго каля 1000 выканаўцаў. Прычым усе канцэрты, акрамя філарманічнага, былі дабрачынныя. Фестываль аб'яднаў выканаўцаў на народных інструментах розных узростаў і рангаў: тут можна было бачыць і чуць юных вучняў ДМШ, навучэнцаў музычных вучылішчаў і студэнтаў ВНУ, прафесійных музыкантаў і аматараў, знакамітых гасцей з замежжа.

Да фестывалю мы вернемся крыху пазней, а зараз мне б хацелася падзяліцца сваімі ўражаннямі аб навукова-практычнай канферэнцыі, якая з'явілася важнай часткай фестывальнай праграмы.

Праз навуковыя даклады, паведамленні, успаміны паплечнікаў і вучняў Георгія Іванавіча перад намі паўстаў партрэт цэласнага, апантанага чалавека, які літаральна паклаў сваё жыццё на алтар айчыннай культуры. Так, прафесар Г. Асмалоўская і дацэнт В. Шчарбак паведамілі прысутным цікавыя біяграфічныя звесткі пра Г. Жыхарава.

Нарадзіўся ён у Слаўгарадзе Магілёўскай вобласці ў інтэлігентнай сям'і. Сваім музычным талентам і першымі ўрокамі музыкі Георгій Жыхараў абавязаны бацьку, які скончыў Маскоўскі універсітэт і як музыкант-аматар добра іграў амаль на ўсіх народных інструментах, а таксама на фартэпіяна. Рана страціўшы маці, Георгій з сястрой выхоўваліся мачахай — жанчынай таксама вельмі культурнай і адукаванай. Юнацкія гады і пачатак музычна-творчай дзейнасці Г. Жыхарава звязаны з Гомелем, куды сям'я пераехала ў 1924 годзе. Рашучы паварот да прафесійнай адукацыі музыканта аказала яго выпадковая сустрэча з кампазітарам Аляксеем Туранковым. Пасля заканчэння Гомельскага музычнага тэхнікума і падрыхтоўчых курсаў Белдзяржкансерваторыі Г. Жыхараў працуе на Беларускім радыё, кіруе аркестравай групай ансамбля БВА. 1939 год прынёс таленавітаму юнаку знамянальную перамогу і званне дыпламанта Усесаюзнага конкурсу-агляду выканаўцаў на народных інструментах у Маскве.

Вайна перакруціла ўсе планы і надзеі. Праз усе ваенныя гады Г. Жыхараў прайшоў з ансамблем БВА ў складзе канцэртнай брыгады, за што атрымаў шэраг баявых узнагарод.

У мірны час ён аддаецца сваёй любімай справе. Кіруе секстэтам домраў Беларускага радыё, выступае як саліст-балалаечнік па радыё, загадвае аддзяленнем народных інструментаў Мінскага музвучылішча імя М. Глінкі. Адначасова з'яўляецца арганізатарам і дырыжорам шматлікіх і розных па складу аркестравых калектываў, вядзе напружаную педагагічную працу ў якасці выкладчыка спецкласаў балалайкі і домры ў ДМШ, школе-дзесяцігодцы пры Белдзяржкансерваторыі, а з 1949 г. з'яўляецца таксама выкладчыкам кафедры народных інструментаў БДК.

У той жа час Г. Жыхараў заканчвае перарваную вучобу і, як падкрэслівае ў сваіх навуковых даследаваннях Г. Асмалоўская, «...яшчэ студэнтам сумесна з І. Жыновічам і Э. Азарэвіч становіцца заснавальнікам кафедры народных інструментаў БДК, а ў 1962 годзе прызначаецца загадчыкам гэтай кафедры. З гэтай пары ўсе свае веды, багаты вопыт, шчодры талент і невярагодную працаздольнасць канцэнтруе на гэтай рабоце».

Зараз нават цяжка сабе ўявіць, як можна было вытрымліваць такую велізарную нагрузку і ўсюды паспяваць! Прычым, як адзначыў у сваім выступленні прафесар В. Чабан, «усебаковая і ўсёахопная дзейнасць Г. Жыхарава характарызуецца вельмі высокай якасцю. Усё, за што б ні браўся Георгій Іванавіч, рабілася надзейна, якасна і рупліва». Педагагічная праца Г. Жыхарава заўсёды была добра спланаваная, метадычна абгрунтаваная і давала плён. Ён імкнуўся да таго, каб кафедра была цэнтрам музычнай культуры, і атрымлівалася сапраўды так. Дастаткова прыгадаць штогадовыя конкурсы выканаўцаў на народных інструментах, якія праводзіла кафедра. Добра памятаю, як мы, тады яшчэ навучэнцы Маладзечанскага музвучылішча, прыязджалі на гэтыя конкурсы, каб пачуць лепшых выканаўцаў. Мне не забыць таго ўражання і таго ўзрушэння, калі я ўпершыню пачула ігру Леаніда Чарняка і Святланы Лясун — тагачасных студэнтаў кансерваторыі...





Г. Жыхараў на рэпетыцыі. Пачатак 70-ых гадоў.



Нацыянальная ... бібліятэка БУК

Пастаянная, шматгадовая праца над рэпертуарам аркестра народных інструментаў — яшчэ адзін велізарны пласт дзейнасці Г. Жыхарава (у гэтым былі аднадушныя амаль усе ўдзельнікі канферэнцыі). Ён пакінуў за 200 выдатна інструментаваных партытур, якія вызначаюцца тонкім густам, глыбокім разуменнем законаў аркестравага пісьма і з'яўляюцца сапраўднымі ўзорамі майстэрства.

З дзяцінства ўвабраўшы ў сябе высокую духоўную атмасферу сям'і, Г. Жыхараў сам з'яўляўся носьбітам лепшых чалавечых якасцяў — інтэлігентнасці, высакародства, сумленнасці і прынцыповасці. Але найбольш прывабным, на мой погляд, быў яго педагагічны талент, які грунтаваўся на гэтых якасцях, а таксама на спагадлівасці да людзей, высокай патрабавальнасці да сябе і да іншых, адданасці сваёй справе. Як загадчык кафедры ён няспынна шукаў па ўсёй рэспубліцы самых лепшых, самых таленавітых выканаўцаў. Амаль усіх сваіх вучняў трымаў у полі зроку. За многімі сачыў з іх дзіцячых гадоў. Прафесар В. Чабан нагадаў пра сшыткі, у якіх Г. Жыхараў фіксаваў усе праграмы сваіх вучняў, аналізаваў, рабіў заўвагі. (Ці знойдуцца зараз дзе-небудзь такія педагогі?!) У яго не было падзелу вучняў на сваіх і чужых. Да ўсіх ён ставіўся з бацькоўскай цеплынёй, спагадлівасцю і патрабавальнасцю. Не ўсім пашчасціла займацца непасрэдна ў класе Г. Жыхарава, але нават тыя, хто вучыўся ў іншых педагогаў, адчувалі на сабе яго клопат і лічылі сваім настаўнікам.



Менавіта Г. Жыхараву належыць заслуга ў выхаванні і фарміраванні цэлага пакалення цудоўных музыкантаў, выканаўцаў, педагогаў, артыстаў, якія вызначаюць сёння стан народнаінструментальнай культуры Беларусі. У сваім дакладзе прафесар Г. Асмалоўская вельмі слушна заўважыла: «Сённяшнім росквітам нашага мастацтва мы абавязаны Г. Жыхараву. Ён надаў гіганцкае паскарэнне развіццю народнаінструментальнага выканальніцтва ў Беларусі».

Прафесар М. Солапаў у сваім выступленні адзначыў такую рысу характару Г. Жыхарава, як бескарыслівасць. Яго ніколі не цікавіў матэрыяльны дабрабыт. Ён ніколі не імкнуўся да раскошы і багацця, аддаючы перавагу ўнутраным, духоўным якасцям чалавека. Ён быў бяссрэбранікам. Напэўна, таму кватэра Георгія Іванавіча нагадвала прытулак аскета. У ёй не было нічога лішняга, толькі самае неабходнае для жыцця і мноства стэлажоў з кнігамі, нотамі, рукапісамі, пласцінкамі.

Жыццёвы лёс Г. Жыхарава быў складаны і шмат у чым несправядлівы да яго. Тытанічная працаздольнасць спалучалася ў ім з неверагоднай сціпласцю. Гэта быў лёс чалавека, які літаральна згарэў на працы, так і не атрымаўшы пры жыцці афіцыйнага прызнання. У яго не было ні гучных тытулаў, ні ганаровых званняў. Нават вучонае званне дацэнта было прысвоена за некалькі месяцаў да ягонай смерці. Імя Г. Жыхарава адсутнічае ў Беларускай савецкай энцыклапедыі, не знойдзеце вы яго і ў Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва. Але няўмольны час і хада гісторыі ўсё ставяць на сваё месца. Сённяшняя грамадская цікавасць да асобы Г. Жыхарава, першыя публікацыі пра яго ў беларускіх і замежных выданнях сведчаць пра тое, які глыбокі след пакінуў гэты чалавек у гісторыі музычнай культуры Беларусі.

(Заканчэнне ў наступным нумары.)



Секстэт балалаек Беларускага радыё. Першы злева — Г. Жыхараў. Саліст — Ю. Смірноў (у цэнтры). Канец 50-ых гадоў.

Секстэт домр Беларускага радыё. Кіраўнік — Г. Жыхараў (першы злева). Салістка — народная артыстка Беларусі Р. Млодэк. 1951 г.

У матэрыяле выкарыстаны фота з архіваў Г. Жыхарава, М. Солапава, Б. Мацкевіч.